# БЕЛАРУСЬ і ГЕРМАНІЯ: гісторыя і сучаснасць

У Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце 26 красавіка 2007 г. адбылася VI Міжнародная навуковая канферэнцыя. У ёй бралі ўдзел гісторыкі, культуролагі, эканамісты, філолагі, філосафы Беларусі, Германіі, Латвіі, Польшчы і Расіі. Яна ўпершыню праводзілася ў рамках "Дзён навукі ў МДЛУ". Адным з арганізатараў канферэнцыі ў гэтым годзе выступіў Інстытут гісторыі НАН Беларусі. Прарэктар па навуковай рабоце універсітэта прафесар А.М.Гарлатаў адзначыў, што на кафедры гісторыі і беларусазнаўства стала добрай традыцыяй праводзіць навуковыя сустрэчы, прысвечаныя беларуска-германскім адносінам. Сярод розных аспектаў гістарычнага мінулага большасць удзельнікаў канферэнцыі даследуюць малавядомыя старонкі ваеннай гісторыі Беларусі, асабліва падзеі Другой сусветнай вайны.

Падчас канферэнцыі адбыліся тры пленарныя пасяджэнні. Першае называлася "Беларусь і Германія: погляд праз стагоддзі". Пра культурную мінуўшчыну беларускага краю, нямецкія культурныя ўплывы на замкавае дойлідства ВКЛ паведаміў загадчык кафедры паліталогіі МДЛУ А.М.Кушнярэвіч. "Беларускі след" у дзейнасці расійска-германскага легіёна, створанага з ваеннапалонных у ходзе вайны 1812 г., даследаваў А.Л.Самовіч, дацэнт факультэта аператыўнага мастацтва Генеральнага штаба Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь. Кандыдат гістарычных навук М.У.Смяховіч выступіў з паведамленнем на тэму "Тэарэтыка-метадалагічныя катэгорыі і прынцыпы навуковага даследавання ў нямецкай гістарыяграфіі канца XVIII—XIX ст.". Выкладчык БДТУ В.М.Астрога паведаміла аб падрыхтоўцы спецыялістаў для сярэдніх навучальных устаноў у Германіі і Расійскай імперыі ў другой палове XIX— пачатку XX ст.

Асаблівую ўвагу на гэтым пленарным пасяджэнні беларускія і расійскія гісторыкі надалі пытанням Першай сусветнай вайны і яе ўплыву на міжнародную палітыку, культурнае жыццё і г.д. Дацэнт факультэта еўрапейскіх даследаванняў Санкт-Пецярбургскага універсітэта І.М.Новікава паведаміла пра спробы заключэння сепаратнага міру прадстаўнікамі расійскіх і германскіх урадавых колаў. Навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі А.М.Рэзнік распавядаў пра беларуска-нямецкае ўзаемадзеянне ў галіне культуры і навукі падчас Першай сусветнай вайны. Навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі У.В.Ляхоўскі расказаў, як пасля падпісання Брэсцкага міру праходзіла школьнае жыццё на занятай тэрыторыі Беларусі. Пра нацыянальна-культурнае жыццё Беларусі ў 1918 г. паведаміў старшы навуковы супрацоўнік гэтага інстытута В.Г.Мазец. Гродзенскія гісторыкі, прафесар Я.М.Цішчанка і дацэнт С.А.Сіткевіч, вызначылі агульнае і асаблівае ў медыцынскай справе ў Мінску і Віцебску ў 1918 г.

Прафесар кафедры міжнародных адносін БДУ У.Е.Снапкоўскі на аснове арыгінальных дакументальных крыніц асвятліў асаблівасці беларуска-германскіх адносін у 1918—1921 гг. Дацэнт кафедры новай, навейшай гісторыі і міжнародных адносін Іванаўскага дзяржаўнага універсітэта В.Л.Чарнапёраў засяродзіў увагу даследчыкаў на малавядомых аспектах сумеснай дзейнасці германскіх нацыяналістаў і расійскіх бальшавікоў па падрыхтоўцы выступлення супраць Польшчы і краін Антанты ў 1919—пачатку 1921 г. Пра адаптацыю расійскіх эмігрантаў у Германіі ў 1920-я гг. паведаміла дацэнт БДУ В.В.Брыгадзіна. Загадчык кафедры старажытных цывілізацый і сярэдневякоўя БДПУ імя Максіма Танка прафесар У.В.Тугай ахарактарызаваў асаблівасці культуры нямецкага этнасу ў Беларусі ў 1920-я гг. Дацэнт МДЛУ М.Р.Жаркоў прааналізаваў пытанне пра ўз'яднанне беларускага народа ў кантэксце савецка-германскага дагавора 1939 г.

Другое пленарнае пасяджэнне "Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны: актуальныя праблемы гісторыі, гістарыяграфіі і крыніцазнаўства" сабрала самую вялікую колькасць беларускіх і замежных навукоўцаў.

Асаблівы інтарэс выклікалі выступленні галоўнага спецыяліста Цэнтральнага архіва КДБ Рэспублікі Беларусь А.Г.Зельскага на тэму "Прапаўшыя без вестак спецгрупы НКУС БССР (1942—1943 гг.)" і прафесара БДПУ імя Максіма Танка Э.Р.Іофе "Нямецкія спецслужбы супраць антыфашысцкага падполля на тэрыторыі Беларусі ў 1941—1944 гг.".

Кандыдат гістарычных навук Ю.В.Грыбоўскі, які цяпер працуе ў Варшаўскім універсітэце, паказаў удзел беларусаў у польскім антыфашысцкім руху Супраціўлення (1939—1945). Прафесар Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь С.Р.Лютко разгледзеў пытанні эвакуацыі ў чэрвені—ліпені 1941 г. людскіх і матэрыяльных рэсурсаў з тэрыторыі Мінскай вобласці. Намеснік дырэктара Інстытута гісторыі М.Г.Жылінскі прааналізаваў дзейнасць моладзі Беларусі ў пачатковы перыяд Вялікай Айчыннай вайны. Навуковы супрацоўнік гэтага інстытута Р.К.Паўловіч расказаў пра партызанскі рух у Гомельскай вобласці летам 1941—восенню 1943 г.

Асістэнт БДЭУ І.І.Сацукевіч вызначыў тэрыторыю, на якой дзейнічалі члены мінскага падполля ў гады вайны. Дацэнт МДЛУ У.І.Курганаў ахарактарызаваў патрыятычную дзейнасць праваслаўнай царквы ў час вайны.

Старшы выкладчык МДЛУ С.П.Кубека паказаў асаблівасці германскага "новага парадку" на акупіраванай тэрыторыі Беларусі ў 1941—1944 гг. Малодшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі С.Л.Казлова асвятліла пытанні развіцця сельскагаспадарчай вытворчасці на тэрыторыі заходніх абласцей Беларусі ў канцы 1941—1942 гг. Дацэнт МДЛУ Я.А.Грэбень разгледзеў судовую сістэму на акупіраванай тэрыторыі Беларусі ў 1941—1944 гг.

Прафесар БДУ У.К.Коршук пазнаёміў удзельнікаў канферэнцыі з арыгінальным поглядам на трагічны лёс савецкіх ваеннапалонных на тэрыторыі Беларусі. Аспірантка Віцебскага дзяржаўнага універсітэта імя П.М.Машэрава В.Я.Бездзель паказала дзейнасць дзіцячых дамоў на Віцебшчыне ў час германскай акупацыі. Дацэнт гэтага універсітэта Г.М.Якаўлева разгледзела сацыяльна-эканамічнае жыццё і палітыка-ідэалагічную сітуацыю ў Полацкай вобласці ў канцы 1944—1945 гг. Выкладчык БДУ Я.З.Басін звярнуўся да тэмы "Халакост і саюзнікі Гітлера". Дацэнт БДУ А.С.Хадасевіч паказала, як на прыкладах з гісторыі Вялікай Айчыннай вайны фарміруецца патрыятызм.

Вялікую цікавасць выклікала абмеркаванне праблем гістарыяграфіі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Доктар гісторыі Майнцкага універсітэта А.Бракель вызначыў некаторыя новыя аспекты гістарыяграфіі "партызанскай барацьбы" ў Беларусі ў 1941-1944 гг. Аспірант Інстытута гісторыі Я.П.Бязлепкін прааналізаваў падыходы замежных даследчыкаў да гісторыі партызанскага руху ў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Дацэнт Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта імя А.С.Пушкіна У.В.Здановіч прапанаваў асабістыя вынікі даследавання колькаснага складу партызанскіх фарміраванняў на тэрыторыі Беларусі. Аспірант БДУ С.М.Тукала разгледзеў навейшую айчынную і замежную гістарыяграфію па гісторыі гета ў г. Мінску. Галоўны спецыяліст ваенна-навуковага камітэта Узброеных сіл Рэспублікі Беларусь У.Я.Калаткоў пазнаёміў з сучаснымі напрацоўкамі германскіх гісторыкаў пра грамадска-культурнае жыццё мясцовага насельніцтва на акупіраванай тэрыторыі Беларусі. Дацэнт МДЛУ С.Я.Новікаў паказаў навуковую значнасць гістарыяграфічнай кампаратывістыкі як унікальнага метаду па даследаванні айчыннай і замежнай гістарыяграфіі гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны ў кантэксце Другой сусветнай вайны.

Пытанні крыніцазнаўства асвятлялі супрацоўнікі Інстытута гісторыі І.Ю.Варанкова ў паведамленні "Асабістыя дакументы нямецкіх ваеннаслужачых 1939—1945 гг. у фондах Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны", доктар гістарычных навук А.М.Літвін — "Сведчанні нямецкага ваеннапалоннага Рэйнгольда Хорста Генрыха пра баявы "Саюз барацьбы з бальшавізмам", кандыдат гістарычных навук У.І.Кузьменка — "Беларуская навуковая суполка" (1942—1944): сучаснае бачанне праблемы". Дацэнт БДУІР Я.І.Бараноўскі на матэрыялах нямецкага трафейнага архіва вызначыў асаблівасці жыцця і паводзін грамадзян Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Выкладчык МДЛУ С.П.Паўлавіцкі прааналізаваў "Стэнаграму нарады вышэйшага кіраўніцтва Генеральнай акругі "Беларусь", якая праходзіла ў Мінску 8—10 красавіка 1943 г.", і засяродзіў увагу удзельнікаў канферэнцыі на праблемах перакладу гістарычных дакументаў па гісторыі Беларусі. Дацэнт МДЛУ І.Я.Есілевіч, выкарыстоўваючы ўспаміны малалетніх вязняў нацысцкіх лагераў, паказаў, наколькі трагічным было іх жыццё. Прадэкан Даўгаўпілскага універсітэта З.Аляхновіч зрабіў аналіз перыядычнага друку Латвіі ў перыяд нацысцкай акупацыі.

Трэцяе пленарнае пасяджэнне называлася "Беларусь і Германія: у пошуках новых даследчыцкіх напрамкаў". Навукоўцы закранаді мінулыя і сучасныя адносіны дзвюх краін. Дацэнт В.А.Астрога паказаў вынікі супрацоўніцтва гісторыкаў Беларускага дзяржаўнага і Йенскага універсітэтаў на працягу 1967—1991 гг. Аспірантка Інстытута гісторыі К.А.Крывічаніна ахарактарызавала беларуска-нямецкія навуковыя кантакты ў 1990-я гг. Дацэнт Міжнароднага інстытута працоўных і сацыяльных адносін А.У.Русаковіч расказаў пра ўстанаўленне дыпламатычных адносін Рэспублікі Беларусь і ФРГ.

Значную ўвагу даследчыкі надавалі пытанням эканамічнага і культурнага супрацоўніцтва. Дацэнт МДЛУ І.С.Благуш выступіла з паведамленнем "Эканоміка Германіі 2001–2006 гг.: прычыны і дасягненні "ціхай рэвалюцыі". Дацэнт БДУ В.М.Галай вызначыла гісторыка-культурныя фактары распаўсюджвання германізмаў у беларускай мове. Супрацоўнік Нацыянальнага інстытута адукацыі М.І.Лебедзь паведаміла пра культурныя сувязі паміж БССР і ФРГ у 1965—1990 гг. Дацэнт МДЛУ Т.Л.Ойстрах-Дзямідава разгледзела праблемы эстэтыкі нямецкага рамантычнага жывапісу. Дацэнт МДЛУ А.А.Павільч — падзеі нямецкай гісторыі і культуры ў літаратурнай спадчыне В.Ластоўскага. Кандыдат філалагічных навук У.Л.Сакалоўскі адзначыў уклад Янкі Купалы і Якуба Коласа ў заходнееўрапейскую культуру першай паловы XX ст. Дацэнт БДУ Г.В.Сініла прааналізавала міфалагемы Сарматыі ў лірыцы паэта І.Баброўскага. Выкладчык БДУ Т.С.Супранкова прысвяціла выступленне твору "тэатральна-музычнай эпохі рамантызму" — трэцяму "Фаўсту" І.Гётэ, які напісаў Антоній Генрык Радзівіл. Навуковы супрацоўнік аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ імя Якуба Коласа НАН Беларусі І.А.Сынкова прывяла звесткі пра Беларусь з "Сусветнай хронікі" Х.Шэдэля.

Пры падвядзенні вынікаў канферэнцыі была падтрымана прапанова аб перавыданні "Стэнаграмы нарады вышэйшага кіраўніцтва Генеральнай акругі "Беларусь" у Мінску 8–10 красавіка 1943 г., а таксама аб выданні зборніка матэрыялаў VI Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць".

**Сяргей Новікаў,**
*кандыдат гістарычных навук,*
*загадчык кафедры гісторыі і беларусазнаўства*
*Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага універсітэта.*